# Просторы выражают солидарность с людьми, выходящими на улицы белорусских и российских городов в эти дни.

С теми, кто без причины и правовых норм были погружены в автозаки и задержаны на неопределенное время.

В знак солидарности и трагического осознания повторения истории, которое не может не сблизить, Просторы публикуют плакаты.
Они могут быть использованы для дальнейших протестов против милицейского насилия.

МАЛ.1



У якое менавіта імгненне чалавек, якога дапытваюць з выкарыстаннем "неканвенцыянальнага" метаду, разумее, што пачатак бязмежжу ўжо пакладзены? Магчыма, шмат каму наогул не прыкметна гэта выйсце з зоны нарматыўнасці? А каму-нікаму, ледзь у поле зроку з'яўляецца сіні сілуэт, адразу ж робіцца зразумела што да чаго. Міліцыянт, як і лекар, настаўнік, камандзір у войску, – той, хто як быццам саўладальнік цела грамадзяніна, аднак часта ён карыстаецца гэтым правам вельмі нясціпла.

МАЛ.2



НЕЛЬГА АБЫЙСЦІ ДЫСЦЫПЛІНАРНЫ ХАРАКТАР КАТАВАННЯ. ЯНО ПАЛЯПШАЕ ЦІ ЧЫСЦІЦЬ САПСАВАНАГА ЧАЛЬЦА ГРАМАДСТВА. ПАКОРА Ў ТАКІМ ПЕРАВЫХАВАННІ ПАДОБНАЯ ПАКОРЫ ДЗІЦЯЦІ, ЯКОЕ РАЗУМЕЕ НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ УЗМАХУ КАРНАЙ РУКІ.

МАЛ.3



ІСНАВАННЕ КАТАВАННЯЎ У НАШЫМ ГРАМАДСТВЕ – НА МЯЖЫ МІФА І КАЗКІ. У ФАНТАЗІІ ІНФАНТЫЛІЗАВАНАЙ АХВЯРЫ МІЛІЦЫЯНЕР У СІНЯЙ УНІФОРМЕ – ГЭТА ЗАБОЙЦА СІНЯЯ БАРАДА. У АДМЫСЛОВЫМ, ЖУДАСНЫМ ПРАЦЭДУРНЫМ ПАКОІ НАСТОЛЬКІ ТОЎСТЫЯ СЦЕНЫ, ШТО НАМ НЕ ПАЧУЦЬ КРЫК, ШТО ДАНОСІЦЦА АДТУЛЬ, НА КЛЮЧАХ АД ГЭТАГА ПАКОЯ НЯМА НІ ПЛЯМКІ КРЫВІ.

МАЛ.4



«Ластаўка» – стаянне на галаве ці на пальцах ног – гэта карысныя гімнастычныя практыкаванні. Імі ты сімвалічна беражэш сваё цела. «Слонік», ушчэмленыя дзвярыма пальцы, прымацаваныя да вушэй ці гэніталій тэлефонныя правады – ахвяра пачуваецца як дома, для яе створаны ўмовы максімальна падобныя да паўсядзённага жыцця, усяго толькі трэба стаць карыснымі для статыстыкі.

МАЛ.5



Гэта ахвяра апынілася ў небяспечнай для жыцця сітуацыі, а кат-міліцыянер – на працы спрытна важдаецца з ляжачым арыштантам, ён проста робіць сваю працу, выконвае дзяржаўную замову.

І не забывайце ўсміхацца!

МАЛ.6



КАТАВАННІ МОЖНА ХАРАКТАРЫЗАВАЦЬ АБО З ПАЗІЦЫІ СТРУКТУР (ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫХ), ЛЮДЗЕЙ-АБАРОНЦАЎ І ДЫСКУРСУ "ПРАЎ ЧАЛАВЕКА" – ЯК "БАЧНАЕ НЕНАРМАТЫЎНАЕ", БО ЁСЦЬ ЖА СТАТЫСТЫКА, ЁСЦЬ СВЕДЧАННІ; АБО З ПАЗІЦЫЙ БОЛЬШАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА, МЕТАДАМ ПРАЦЫ З ЯКІМ КАТАВАННЕ І З'ЯЎЛЯЕЦЦА, БО НЕ ТОЛЬКІ З АСОБНА ЎЗЯТЫМ ЦЕЛАМ ПРАЦУЮЦЬ, АЛЕ З МАСАВАЙ СВЯДОМАСЦЮ! З ГЭТЫХ ПАЗІЦЫЙ КАТАВАННЕ ЁСЦЬ "НЯБАЧНАЕ НАРМАТЫЎНАЕ". З ГЭТАГА ПУНКТА ГЛЕДЖАННЯ, СТАТЫСТЫКА, ЯКАЯ ЗАБЯСПЕЧВАЕ БАЧНАСЦЬ, ЗНАХОДЗІЦЦА ТАМ ЖА, ДЗЕ І "ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА", – У СВЕЦЕ МЁРТВЫХ СХЕМ.

МАЛ.7



А ПАКОЛЬКІ КАТАВАННІ АДБЫВАЮЦЦА Ў НЕЙКАЙ ТАГАСВЕТНАЙ ПРАСТОРЫ, ТО І АДКАЗНАСЦЬ НІЯКІМ ЧЫНАМ НЕ МОЖА ЛЕГЧЫ НА ПЛЕЧЫ ТЫХ, ХТО ПА ГЭТЫ БОК. НЯБАЧНАСЦЬ – ГЭТА АМАЛЬ АДСУТНАСЦЬ. ДЗЯДЗЬКА ІДЗЕ ЗА ХЛЕБАМ, У ХАЦЕ ПОБАЧ КАГОСЬЦІ ТЫМ ЧАСАМ КАТУЮЦЬ. ДЗЯДЗЬКА ВЕДАЕ, РАЗ ЖЫВЕ ПОБАЧ, ШТО ГЭТА АДДЗЯЛЕННЕ МІЛІЦЫІ, А РАЗ АДДЗЯЛЕННЕ МІЛІЦЫІ – ЗНАЧЫЦЬ, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, КАТУЮЦЬ? ВЕЛЬМІ НЯДОБРАНАДЗЕЙНАЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПАЗІЦЫЯ, АБ ЯКОЙ СВЕДЧЫЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫ. ЁН (ЦІ ЯНА) ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ АМАРАЛЬНА – ПАДВЯРГАЕ НЕБЯСПЕЦЫ СВАЯКОЎ – БО ПАПЯРЭДЖВАЛІ Ж! ЯШЧЭ ЁСЦЬ СОРАМ – У ГЭТЫМ СТАЎЛЕННІ АХВЯРА КАТАВАННЯ АПЫНАЕЦЦА Ў СТАНОВІШЧЫ АХВЯРЫ ЗГВАЛТАВАННЯ (ЧАСТАГА СПОСАБУ КАТАВАННЯ). УВЯДЗЕННЕ МІЛІЦЭЙСКАГА ДРУЧКА Ў АНУС АЗНАЧАЮЦЬ ВЫВАД «ПАЦЫЕНТА» ЗА РЫСУ ЧАЛАВЕЧАЙ ДОБРАЗЫЧЛІВАЙ УСЕАГУЛЬНАСЦІ. КАЗАЦЬ ПРА ТАКОЕ – ЗНАЧЫЦЬ ЗДРАДЖВАЦЬ САМОМУ САБЕ ЯК «ЧАЛАВЕКУ СЯРОД ЛЮДЗЕЙ», НЕ КАЖУЧЫ ПРА ШМАТЛІКІХ БЛІЗКІХ.

МАЛ.8



НЕ МАЮЧЫ АСОБАСНАЙ ІНТЭНЦЫІ, КАТАВАННЕ БЫЦЦАМ ПРЫМУШАЕ АХВЯРУ ПАДЫСЦІ ДА ВЯЛІКАЙ ФАТАГРАФІІ ДЫ ПРАСУНУЦЬ ГАЛАВУ Ў ВЫРАЗАНУЮ АДТУЛІНУ. МАЛЮНАК ЗАСТАЕЦЦА ЗАЎСЁДЫ ТЫМ САМЫМ, ТОЛЬКІ ТВАР ЗМЯНЯЕЦЦА. ТАКАЯ САБЕ ТЭАТРАЛЬНАЯ ДЭКАРАЦЫЯ, А МОЖА, І ЦЫРКАВАЯ АРЭНА, ТАМУ КАТАВАННІ ЗБОЛЬШАГА НАГАДВАЮЦЬ АКРАБАТЫЧНЫЯ ТРУКІ. АДНЫМ З САМЫХ НЕБЯСПЕЧНЫХ (АТРЫМЛІВАЕЦЦА ТОЛЬКІ Ў АБРАНЫХ) ЗАСТАЕЦЦА СКАЧОК З ВАКНА. СПРОБА ЗМЯНІЦЬ УСТАЛЯВАНЫЯ РЫТУАЛЫ МОЖА СКОНЧЫЦЦА КАЛЕЦТВАМ, АЛЕ РАІМ УСЁ Ж ПАСПРАБАВАЦЬ.

Плакаты являются частью работы "Процедурная комната" (2009-2010) Никиты Кадана.
Они были изданы неограниченным тиражом и использовались в различных протестах.
Текст: Екатерина Мищенко, Никита Кадан. Перевод Анастасии Живковой (2011).